# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

На хвалі

# ТАЛЕНТАЎ МЕНШ НЕ СТАЛА

**IX Рэспубліканскі творчы радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі», галоўнай тэмай якога сёлета стала 75-годдзе Вялікай Перамогі, набліжаецца да свайго фіналу.**

На адрас арганізатараў творчага спаборніцтва паступіла каля 400 заявак. З іх у другі тур дапушчаны былі 243 канкурсанты, а ў трэці — 157 удзельнікаў. Істотнай акалічнасцю стала тое, што праслухоўванні ўпершыню праводзіліся дыстанцыйна, але з максімальнай набліжанасцю да ўмоў жывога. Па выніках трэцяга тура прафесійнае журы на чале са старшынёй — народным артыстам Беларусі Леанідам Захлеўным — вызначыць фіналістаў да 24 красавіка. Завяршальны тур конкурсу, які звычайна праходзіў у Вялікай студыі Дома радыё, з-за эпідэміялагічнай абстаноўкі зрабілі таксама дыстанцыйным — па відэазапісах.

— Нягледзячы на абставіны, якія склаліся, мы атрымалі амаль такую ж колькасць заявак, як і ў мінулым годзе. Гэта сведчыць пра тое, што нам давяраюць, і конкурс з'яўляецца адным з самых прэстыжных рэспубліканскіх спаборніцтваў у нашай краіне. І, напэўна, у гэтым самае моцнае ўражанне. Безумоўна, сённяшняя сітуацыя зрабіла і адмоўны ўплыў на ход спаборніцтва: мы былі вымушаныя спачатку другі, а потым і трэці тур правесці дыстанцыйна, у выніку журы не адчувае жывой энергіі канкурсантаў. Але ёсць і станоўчы момант — у тым, што журы можа вярнуцца да прадстаўленых запісаў, параўнаць іх. Бо раней, вядома, ярчэй запаміналіся тыя ўдзельнікі, каго чулі бліжэй да фіналу праслухоўвання. Я думаю, што на аб'ектыўнасць вынікаў паўплывае менавіта гэтая магчымасць пераглядзець і параўнаць. Узровень падрыхтоўкі кожны год застаецца стабільна высокім і канкурэнцыя вялікая, — адзначае **кіраўнік і аўтар праекта «Маладыя таленты Беларусі» Таццяна ЯКУШАВА.** — Удзельнікам на будучыню магу сказаць: раскрывайце сябе, заставайцеся асобамі, шукайце спосабы прадэманстраваць свае таленты і здольнасці. Бо калі чалавек — асоба, то зможа на любым інструменце і ў выкананні любога твора паказаць майстэрства і прафесіяналізм.




Нагадаем, што навіны і падрабязнасці конкурсу вы можаце знайсці на сайце Першага нацыянальнага канала беларускага радыё www.radio1.by, а таксама на афіцыйных старонках канала ў сацыяльных сетках. А ў радыёэфіры пра ход і вынікі конкурсу кожную нядзелю ў 09.05 расказвае аднайменная праграма «Маладыя таленты Беларусі». Тут жа прагучаць і музычныя творы ў выкананні пераможцаў і уладальнікаў спецыяльных прызоў сёлетняга спаборніцтва.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ
(«Звязда») Выпуск № 112

Сёння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

**№ 35**



**№ 35**

**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, f4, e5, g5, c7, белыя дамкі: g3 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** c3, b4, a5, c5, h6, g7, чорныя дамкі: a1, b8 (8).

**№ 36**

**Белыя простыя шашкі:** h2, b6, d6, f6 (4).

**Чорныя простыя шашкі:** g3, b4, d4, f4, h4, a7 (6).

**№ 37**

**Белыя простыя шашкі:** 38, 39, 40, 31, 33, 34 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** 26, 23, 25, 20, 8, 9, 10 (7).

**№ 38**

**Белыя простыя шашкі:** 37, 39, 31, 32, 27, 28, 30, 25, 16 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** 34, 26, 21, 17, 18, 14, 15, 6, 8 (9).

Дзве наступныя пазіцыі, складзеныя па правілах бразільскіх шашак.

**№ 39**

**Белыя простыя шашкі:** e5, d6, c7, белыя дамкі: h6 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** c3, h4, g7, b8, f8 (5).

**№ 40**

**Белыя простыя шашкі:** g1, h2, e5, f6, h6, g7 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, b4, c5, c7, h8 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія першыя дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 111 ад 10.04.20.

№ 32 1. c3-b4 a5:c3 2. g3-f4 e5:g3 3. d4-e5 f6:d4 4. e3-f4 g3:e5 5. f2-e3 d4:f2 6. b2:a5+

№ 33 1. c5-d6 c7:e5 2. a5:c7 d8:b6 3. d4-c5 b6:d4 4. b4-a5+

№ 34 1. c5-d6 c7:e5 2. a5:c7 b8:d6 3. d4-c5 a7-b6 4. c5:a7+

Пазіцыі Д. Яраша спадабаліся нашым чытачам. Вось адзін з водгукаў, што даслаў Фёдар Карпей з Мядзела: «Дзякую нашаму ўкраінскаму аўтару за творчасць! Было цікава рашаць!»

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

Анонс: штодня ў 20:30 на гульнявым сайце https://www.playok.com/ru праводзяцца анлайн-турніры па рускіх шашках (арганізатар belarusdr, кантроль часу 3 хвіліны плюс 2 секунды, 7 тураў). Да ўдзелу запрашаюцца ўсе ахвотныя.

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013.*

*E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

Сядзі і глядзі

# З КІМ РАНІЦУ ПАЧНЕШ...

**Дзмітрый Цераха ў стаў часткай каманды «Нашай раніцы» на АНТ у пачатку года, і вось ужо працяглы час ён у пары з Таццянай Рудакоўскай настройвае гледачоў на сустрэчу новага дня. «Звязда» распытала ў вядучага, чым ён жыве па-за эфірам, а заадно выРашыла пазнаёміць нашых чытачоў з ім бліжэй.**

Дзмітрый прыйшоў на тэлеканал АНТ пасля адбору, які тут ладзілі летась у некалькі этапаў. Сярод прэтэндэнтаў было 300 чалавек, аднак менавіта на асобе гэтага маладога чалавека спыніла свой выбар фокус-група на фінальным этапе. Сам вядучы згадвае:

— Прайсці кастынг было не самым складаным, але хваляванне прысутнічала. Адбор ладзілі ў тры этапы: знаёмства, запісы пілотаў розных праграм і трэці этап, калі выбіралі ўжо з некалькіх чалавек. Я на фінал прыехаў крыху прастуджаны, і мне здавалася, быццам нешта не так складваецца, але ў выніку пачуў: «Рыхтуйцеся да эфіру 14 студзеня».

Калі напачатку Дзмітрый адчуваў уласную зацінутасць (бо гэта ж работа на новым месцы і на іншым узроўні, дзе трэба ўнікнуць у дэталі працэсу), то сёння дзякуючы падтрымцы і парадам каманды і сваёй суВядучай пачуваецца разняволена. Верагодна, дапамог у пэўнай меры жыццёвы і прафесійны вопыт, які вядучы меў да прыходу на тэлеканал: Дзмітрый вучыўся ў музычнай школе, нават збіраўся паступаць у тэатральнае, — але ў выніку апынуўся на факультэце іспанскай мовы ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. Зрэшты, канцэрты і капуснікі ўвагай не абмінаў. нейкі час працаваў па прафесіі (быў выкладчыкам іспанскай мовы), увайшоў і застаецца ў камандзе арганізатараў папулярных гарадскіх фестываляў, а потым у адзін цудоўны момант паехаў на кастынг у Гродна, дзе шукалі вядучага для рэгіянальнага тэлеканала. І вось яго, мінчаніна, зацвердзілі — і Дзмітрый старанна ездзіў у Гродна на здымкі праграмы, спасцігаючы знутры тэлевізійную кухню. Так было на працягу двух з палавай гадоў, а потым жыццё падкінула новы маршрут і прывяло яго на «Нашу раніцу».



Цяпер на экране дуэт вядучых. А па-за кадрам Дзіма — шчаслівы муж і тата пяцігадовай дачкі. Таксама можна ўбачыць яго ў ролі вядучага разнастайных свят, але зараз не да ўрачыстых падзей, таму ўдаецца больш часу праводзіць з сям'ёй, чытаць кнігі і займацца спортам. «Адна з галоўных рэчаў, якую я сказаў бы сабе ў мінулым, — гэта тое, што трэба больш чытаць, пакуль вольны час дазваляе», — дзеліцца тэлезорка. А напрыклад, магчымасць паехаць на шпацыр па лесе — гэта найлепшая эмацыянальная падзарадка. Дзмітрый прызнаецца, што для ўзяцця новых вяршынь па жыцці яму патрэбна натхненне, якое можна знайсці ў самых розных рэчах: пераглядзе фільма, цікавай перадачы ці проста ў выпадковай сустрэчы з нейкім чалавекам на вуліцы — усё прыходзіць у час і ў патрэбным месцы.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва Дзмітрыя ЦЕРАХАВА.**

## Бліц-апытанне для Дзмітрыя Церахава:

**1. Што вы адчувалі пасля першага эфіру на «Нашай раніцы»?** — Было пачуццё пэўнай эмацыянальнай вышчынасці, бо пачаў нешта новае і ў пэўнай меры складанае. Не абышлося без хвалявання. А потым прыйшло ўсведамленне: ты ганарышся тым фактам, што атрымаў магчымасць стаць вядучым на АНТ. Бо, улічваючы колькасць прэтэндэнтаў на кастынгу, не ўсякі мог апынуцца на тваім месцы, а пашчасціла табе. Не абышлося і без думак пра тое, што цяпер трэба шмат працаваць над сабой і ўдасканальвацца. Яны ёсць і сёння.

**2. Чаму вы навучыліся дзякуючы рабоце вядучага?** — Самая галоўная выснова, якую дала мне гэтая праца, — усведамленне, што варта адпавядаць дадзенай ролі, што б ні адбывалася ў той момант з табой. А бываюць жа розныя абставіны, і дрэнны настрой, і кепскае самаадчуванне. Таксама важная рэч — уменне сказаць «не» ў нейкіх момантах, бо ты аднача сова і ў кампаніі людзей, але як вядучы павінен кіраваць працэсам... На тэлебачанні, у прыватнасці, я атрымліваю таксама ўменне працаваць у пары, калі важна вытрымліваць баланс і не перацягваць коўдру на сябе.

**3. Як вы змяніліся з нараджэннем дачкі?** — Я пастарэў на пяць з паловай гадоў *(Смяецца)*. І зразумеў, як важна выхоўваць сябе, калі хочаш быць годным прыкладам для свайго дзіцяці. Усведамляючы, што я тата дзяўчынкі, імкнуся даваць ёй добры прыклад мужчыны, бо аднойчы, абапіраючыся на гэты вопыт, яна будзе шукаць сваю палавінку. Яшчэ адна з важных рэчаў — разуменне таго, як важна пакідаць усе праблемы і непрыемнасці за дзвярыма вашай кватэры. Блізкіх трэба берагчы.

**4. З чаго смяяліся апошнім часам ад душы?** — Я часта смяюся проста з жыцця. Прычым, як кажа мая жонка Каця, гэта могуць быць сітуацыі, на якія іншы чалавек абсалютна так не адрэагаваў бы. Люблю пасмяяцца, у тым ліку і з самога сябе.

**5. На што патрацілі б 25-ю гадзіну ў сутках?** — Самае банальнае — на сон. Але лепш усё ж такі правесці такую гадзіну з сям'ёй, назіраючы за заходам сонца з кубачкам чаю.